Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. 2. / редкол.: А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. — Минск : БГУ, 2007. — 263 с.

# КОРОТКО О КНИГАХ

**Giza A. Bośnia i Hercegowina w dobie tureckiego i austryjackiego panowania (1800—1914).** Szczecin: Uniwersytet Szczeciński. Rozprawy i studia. T. (CDXCIII) 419, 2002. 184 s. Тираж не указан.

Кніга «Боснія і Герцагавіна падчас турэцкага і аўстрыйскага панавання (1800—1914)» уяўляе сабой чарговае даследаванне А. Гізы па гісторыі паўднёвых славян. Як адзначае сам аўтар, яго матывам было жа-



данне ліквідаваць пэўныя прабелы ў веданні палякамі гісторыі суседніх паўднёваславянскіх народаў.

Падмурак даследавання складаюць дакументы з Сербскага архіва ў Бялградзе, Архіва Чартарыскіх у Кракаве, Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Маскве, а таксама выдадзеныя зборнікі дакументаў, дзённікі і мемуары, перыядычны друк.

Першы раздзел прысвечаны гісторыі краю ў першай палове XIX ст. Пасля ўступнай інфармацыі, прысвечанай гісторыі краю да XIX ст., ідзе характарыстыка сітуацыі ў сельскай мясцовасці і вызначэнне спецыфікі гарадоў. Потым прадстаўлена палітыка Сербіі ў адносінах да Босніі і Герцагавіны. Другі раздзел «Боснія і Герцагавіна падчас балканскага крызіса 1875—1878 гг.» А. Гіза пачынае з аналізу ўплыву панславянскай і пансербскай ідэалогіі на мясцовае насельніцтва і толькі потым пераходзіць непасрэдна да паўстання 1875—1876 гг. у Босніі і Герцагавіне, вайны Сербіі і Чарнагорыі з Турцыяй і руска-турэцкай вайны 1877—1878 гг.

Трэці раздзел «Боснія і Герцагавіна на рубяжы XIX—XX ст.» ахоплівае перыяд з 1878 па 1908 г. У ім аўтар характарызуе становішча краю падчас аўстра-венгерскай акупацыі, засяроджваючы ўвагу на эканамічным, сацыяльным і культурным развіцці рэгіёна. Асобны пункт прысвечаны разгляду польскай эміграцыі на тэрыторыі Босніі і Герцагавіны, як часткі дзяржаўнай каланізацыйнай палітыкі Аўстра-Венгрыі ў 1896—1905 гг.

Апошні радзел манаграфіі прысвечаны падзеям ад анексіі Босніі і Герцагавіны 7 кастрычніка 1908 г. да пакушэння 28 чэрвеня 1914 г. на эрцгерцага Франца-Фердынанда. Аўтар спрабуе высветліць роль неаславізма ў баснійскім крызісе 1908 г. і пазіцыі нацыянальных дзеячаў, адзначае змены ў палітычным, сацыяльна-эканамічным жыцці краю пасля анексіі. Асобныя пункты прысвечаны непасрэдна пакушэнню 28 чэрвеня 1914 г. і лёсу яго выканаўцаў.

Асобна вынесены бібліяграфія, спіс ілюстрацый, рэзюме на французскай мове, паказальнік імёнаў і геаграфічных мясцін.

*Л. А. Козік*